# Гісторыя

І. У. ШАРДЫКА

## ДА ПЫТАННЯ АБ КОЛЬКАСНЫМ І САЦЫЯЛЬНЫМ СКЛАДЗЕ АРГАНІЗАЦЫЙ КАДЭЦКАЙ ПАРТЫІ НА БЕЛАРУСІ Ў 1917 Г.

Партыя кадэтаў актыўна заявіла аб сабе яшчэ ў гады першай рускай рэвалюцыі. Як вядома, яе арганізацыйнае афармленне адбылося ў кастрычніку 1905 г. З гэтага моманту і да самага распаду яна з'яўлялася галоўнай партыяй расійскай ліберальнай буржуазіі. Кадэцкая партыя ставіла сваёй мэтай рэфармаваць расійскае грамадства мірным шляхам, разлічваючы пры гэтым на паступовае ўсталяванне парламенцкай дэмакратыі замест самаўладдзя. Па сутнасці, гады першай расійскай рэвалюцыі для кадэтаў былі школай пагаднення і кампрамісаў, рэпетыцыяй стварэння класавага міру ў імя прагрэсу і хуткага буржуазнага развіцця Расіі. У 1905 г. кадэцкая партыя аб'ядноўвала ў сваіх шэрагах амаль 100 тыс. членаў [1], у наступныя гады колькасць партыі значна скарацілася.

У перыяд рэакцыі як цэнтральныя, так і асабліва мясцовыя органы ўлады не толькі ўзмацнілі палітыку рэпрэсій супраць рэвалюцыйна-дэмакратычных партый, але праявілі гатоўнасць заадно расправіцца і з ненавіснымі ім кадэтамі. У 1913 г. на партыйнай майскай канферэнцыі П. М. Мілюкоў канстатаваў: «Партыя канстытуцыйных дэмакратаў знаходзіцца фармальна ў разлажэнні» [2]. З 1907 па 1914 гг. спынілі існаванне 15 губернскіх, 50 гарадскіх, 132 павятовых і 69 валасных кадэцкіх арганізацый. Не абмінуў гэты працэс і Беларусь. Прафесар В. В. Шалахаеў адносіў Беларусь да рэгіёнаў, у якіх кадэцкія арганізацыі напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі існавалі ў «адзінкавым ліку». Змяншэнне колькасці мясцовых арганізацый прывяло да значнага скарачэння колькаснага складу кадэцкай партыі ў цэлым. Да пачатку першай сусветнай вайны яна не перавышала 10—12 тыс. чалавек, г. зн. скарацілася ў параўнанні з перыядам рэвалюцыі 1905—1907 гг. у пяць разоў [3].

Пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі агульная колькасць кадэцкіх арганізацый у краіне відавочна ўзрасла. На канец мая іх было 183, а да восені — ужо 370. Арганізацыі партыі кадэтаў дзейнічалі ў Петраградзе і Маскве, у 73 губернскіх і абласных гарадах, у 240 павятовых гарадах і 55 населеных пунктах. Афіцыйных дадзеных аб сваёй колькасці кадэты ў 1917 г. не публікавалі. Савецкія і замежныя гісторыкі лічаць, што яна аб'ядноўвала 65—80 тыс. членаў [4].

На Беларусі новыя кадэцкія арганізацыі пачалі афармляцца адразу пасля звяржэння самаўладдзя. Па меры развіцця рэвалюцыі іх колькасць імкліва ўзрастала. Як паведамляў «Вестник партии Народной свободы», іх налічвалася: на 25 мая 1917 г. — 7, на 22 чэрвеня — 10, на 20 ліпеня — 13, на 31 жніўня — 18. Да канца восені 1917 г. на Беларусі існавала ўжо больш за 30 кадэцкіх арганізацый. Яны актыўна дзейнічалі ў Мінску, Віцебску, Магілёве, а таксама ў 18 павятовых гарадах і ў 10 населеных пунктах [5].

Найбольш значныя кадэцкія арганізацыі на Беларусі ўзніклі ў правінцыі. Так, Горацкі павятовы аддзел партыі Народнай свабоды налічваў звыш

150 членаў. Аддзел выдаваў газету «Горецкий вестник», якая карысталася папулярнасцю далёка за межамі Горацкага павета. Яшчэ больш моцныя кадэцкія арганізацыі дзейнічалі ў Гарадоцкім і Невельскім паветах (у 1917 г. Невельскі павет уваходзіў у склад Віцебскай губерні). Яны аб'ядноўвалі ў сваіх шэрагах адпаведна 200 і 600 членаў партыі. Невельскі аддзел, які з'яўляўся састаўляючай часткай Віцебскай губернскай арганізацыі кадэтаў, быў самым буйным сярод павятовых партыйных аддзелаў краіны. Шматлікія партыйныя групы кадэтаў дзейнічалі ў в. Антонаўка Галянеўскай воласці Чавускага павета Магілёўскай губерні, у м. Прэнь Дзвінскага павета Віцебскай губерні і інш. населеных пунктах [6].

Узнікненне разгалінаванай сеткі кадэцкіх арганізацый на Беларусі абумоўлівалася шэрагам прычын. Адыгрывалі сваю ролю фактары як аб'ектыўнага, так і суб'ектыўнага характару. У прыватнасці, на працэс хуткага росту кадэцкіх радоў на Беларусі аказала ўплыў тая акалічнасць, што беларускія губерні з'явіліся тэатрам ваенных дзеянняў: у Мінску, Магілёве, Гомелі, Оршы, Бабруйску і іншых гарадах былі размешчаны буйныя ваенныя і паўваенныя ўстановы (Стаўка, Штаб Заходняга фронту, саюзы земстваў і гарадоў, армейскія штабы і інш.). Многія члены гэтых арганізацый падзялялі ідэі кадэтаў. Натуральна, кіраўніцтва кадэцкай партыі імкнулася арганізаваць іх і павесці за сабой. Не выпадкова ўжо ў сакавіку — красавіку 1917 г. з гэтай мэтай гарады Беларусі і Заходні фронт наведалі прадстаўнікі Часовага ўраду, дэпутаты Дзяржаўнай думы, буйныя дзяржаўныя чыноўнікі, якія ўваходзілі ў склад партыі Народнай свабоды. У чэрвені 1917 г. у Віцебску і некаторых павятовых гарадах губерні пабываў лідэр партыі кадэтаў П. М. Мілюкоў, які выступіў з растлумачэннем праграмных установак партыі. У паездцы яго суправаджаў адзін з кіраўнікоў Петраградскай кадэцкай арганізацыі інжынер У. К. Навіцкі. Восенню 1917 г. у Мінску, Бабруйску і іншых гарадах чытаў лекцыі доктар дзяржаўнага права, прафесар, член ЦК партыі кадэтаў з 1906 г. П. І. Наўгародцаў, які быў вылучаны кандыдатам у дэпутаты Устаноўчага сходу па Магілёўскай выбарчай акрузе [7].

Такая палітыка кадэцкага кіраўніцтва адбілася на арганізацыйным і ідэйным умацаванні кадэцкіх арганізацый на Беларусі і Заходнім фронце. Камандыроўкі ў правінцыю ўпаўнаважаных ЦК партыі Народнай свабоды часта з'яўляліся штуршком да арганізацыі партыйных аддзелаў на месцах. Так, напрыклад, 22 ліпеня ў Рагачове пасля лекцыі ўпаўнаважанага ЦК П. І. Генры «Аб палітычнай і сацыяльнай праграмах партыі кадэтаў» прысутныя «выявілі жаданне заснаваць аддзел партыі ў Рагачове». З гэтай мэтай лідэр рагачоўскіх кадэтаў доктар П. Г. Фербер прызначыў на 23 ліпеня першы арганізацыйны сход [8].

Хуткаму афармленню кадэцкіх арганізацый на Беларусі садзейнічала і тая акалічнасць, што пазіцыі іх галоўных палітычных праціўнікаў — бальшавікоў — адразу ж пасля Лютаўскай рэвалюцыі былі даволі слабыя. Тады на Беларусі і Заходнім фронце наогул не было якой-небудзь афармленай рэвалюцыйнай арганізацыі бальшавіцкага накірунку. Аб гэтым гаварылі многія мясцовыя бальшавіцкія лідэры. Адзін з іх Г. Г. Арыстаў адзначаў, што «адсутнасць дастаткова моцнай бальшавіцкай арганізацыі не давала магчымасці ўзяць у больш або менш арганізаванае рэчышча стыхійны рэвалюцыйны рух мас. Разам з тым гэта паслужыла вялікім аблягчэннем для нашых палітычных праціўнікаў» [9]. Такія абставіны, безумоўна, дапамаглі беларускім кадэтам выканаць дырэктыву партыі — пашырыць свой уплыў на Беларусі і Заходнім фронце.

Аднак найбольш важная прычына, якая паўплывала на колькасны рост кадэцкіх арганізацый на Беларусі ў паслялютаўскі перыяд, была звязана ў першую чаргу са зменай дзяржаўнага статусу, а з ім і тактычнай лініі самой кадэцкай партыі. Фактычна ператварыўшыся ў правячую партыю, кадэты сталі цэнтрам прыцяжэння ўсіх рэфармісцкі настроеных сіл, якія імкнуліся замацаваць у грамадстве прававыя ліберальна-дэмакратычныя асновы, народжаныя рэвалюцыяй. Гэтаму садзейнічала і тактыка партыі Народнай свабоды, якая аказалася больш гібкай у абароне інтарэсаў уласніка, чым тактыка іншых буржуазных і памешчыцкіх партый. Усё гэта істотна паўплывала на пашырэнне базы кадэцкіх арганізацый у Беларусі. Тут кадэцкія шэрагі папаўняліся не толькі прадстаўнікамі звыклых для іх сацыяльных пластоў (ліберальнай буржуазіі, памешчыкаў, буржуазнай інтэлігенцыі, гарадскога чыноўніцтва і мяшчанства), але і выхадцамі з

найбольш дэмакратычных слаёў насельніцтва, перш за ўсё сялян. Пра гэта зазначаў вядомы кадэцкі дзеяч М. І. Іваноў: «Тактыка партыі Народнай свабоды да гэтай пары адпавядала пераважна інтэлігенцкаму сацыяльнаму складу партыі. Вызначаемая зараз жыццём тактыка грамадскага дзеяння павінна адпавядаць ужо іншаму складу партыйных мас, г. зн. яна павінна быць адначасна і тактыкай інтэлігенцыі і дзелавых асоб з шырокіх народных мас, якія магчыма не валодаюць вялікай адукаванасцю, але тым не менш здольныя прымаць удзел у грамадскім жыцці»[10]. Гэтым самым М. І. Іваноў даваў зразумець, што кіраўніцтва кадэцкай партыі было зацікаўлена ў прытоку «дзелавых людзей з шырокіх народных мас» — заможных сялян. Яны і павінны былі надаць кадэцкай партыі арганізацыйную ўстойлівасць на месцах.

Як сведчаць дакументы, заможнае сялянства, у пэўнай ступені, аказала сваю падтрымку кадэтам. Так, згодна паведамленням, якія паступілі ў ЦК з Гарадоцкага аддзела партыі кадэтаў, «акрамя горада камітэт партыі актыўна працаваў у павеце». З 21 воласці Гарадоцкага павета ў 6 сялянства па настрою было суцэльна кадэцкае. Камітэт партыі меў у павеце сваіх даверaных асоб з ліку настаўнікаў, святароў, пажылых сялян, якія праводзілі агітацыйную работу ў вёсцы. У той жа час Віцебскі губернскі камітэт кадэтаў паведамляў, што заможнае і часткова сярэдняе сялянства праяўляюць зацікаўленасць да партыі Народнай свабоды і па меры ўзнікнення на месцах яе арганізацый уліваюцца ў іх састаў. Паведамленні такога роду паступалі і з іншых рэгіёнаў Беларусі [11].

Характэрна, што найбольшую падтрымку кадэты мелі ў абласцях, дзе шырокае развіццё атрымалі хутары і адрубы. Падтрымкі з боку сялян-абшчыннікаў кадэтам дабіцца не ўдалося. На абласным з'ездзе прадстаўнікоў кадэцкіх арганізацый паўночна-заходніх губерній, які праходзіў у ліпені 1917 г. у Петраградзе, кіраўнік віцебскай кадэцкай арганізацыі М. Г. Цітовіч заявіў: «Спачуваюць партыі наступныя элементы: зямельныя ўласнікі, група «Адзінства» і каталіцкае насельніцтва. Хутаране падтрымліваюць партыю, што ж датычыцца абшчыннікаў, то на іх надзеі мала»[12].

Але хоць кадэцкія арганізацыі на Беларусі колькасна выраслі, яны не былі ідэйна і арганізацыйна ўстойлівымі. Перш за ўсё гэта абумоўлівалася сацыяльным складам партыі, які па меры паглыблення рэвалюцыі змяняўся. Калі на мірным этапе развіцця рэвалюцыі ў кадэцкай партыі пераважалі прадстаўнікі дэмакратычных слаёў насельніцтва, то ва ўмовах абвастрэння барацьбы за ўладу яе шэрагі папаўняліся галоўным чынам выхадцамі з маёмасных класаў. Меншавіцкая газета «День» у верасні 1917 г. падкрэслівала, што «калі да рэвалюцыі яшчэ можна было сумнявацца і спрачацца аб тым, якія сацыяльныя спадзяванні выражаюць кадэты, то ў працэсе рэвалюцыі адбылося афармленне партыі. Яна з'яўлялася ідыёлагам значных груп сярэдняй і дробнай буржуазіі; паколькі пад пагрозай «паглыблення» рэвалюцыі буржуазія ўтварае адзіны фронт, кадэты ідуць у нагу і з буйной фінансавай і прамысловай Расіяй»[13]. Гэта тэндэнцыя выразна праявілася і на Беларусі.

У кадэцкай партыі аб'ядналіся тыя сацыяльныя сілы, якія перш за ўсё выяўлялі інтарэсы ўласніка. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі памешчыцкія арганізацыі, якія скампраметавалі сябе абаронай царскага ўрада, распаліся, а іх члены вымушаны былі далучыцца да кадэтаў. Больш таго, яны часта станавіліся арганізатарамі кадэцкіх аддзелаў на месцах. Так, у кадэцкім «Вестнике» паведамлялася, што у маі 1917 г. у мястэчку Свенскаполле Магілёўскай губерні ўладальнікам маёнтка Палякова памешчыкам Густавам Вікенцевічам Валконскім быў створаны аддзел кадэцкай партыі. Памешчыкі выступалі ініцыятарамі стварэння кадэцкіх арганізацый і ў іншых рэгіёнах Беларусі. Кадэцкая прэса тлумачыла гэта так: «Буйныя ўласнікі, землеўладальнікі або гандляры далучаюцца часам да партыі Народнай свабоды... таму што спадзяюцца тут больш, чым у іншых, знайсці апору сваім класавым інтарэсам»[14]. Аднак дамагчыся дамінуючага ўплыву ў кадэцкіх арганізацыях памешчыкі не змаглі.

Па даным прафесара У. А. Куўшынава, у 1917 г. значную частку кадэцкіх арганізацый прадстаўляла інтэлігенцыя і чыноўнікі. Яны пераважалі і ў кадэцкіх арганізацыях Беларусі. Прадстаўнікі інтэлігенцыі і чыноўніцтва складалі кіруючае ядро Мінскага гарадскога, Магілёўскага і Віцебскага губернскіх камітэтаў партыі Народнай свабоды [15].

Шырока вядомымі ў палітычнах кругах Беларусі былі рэдактар газеты «Минская жизнь» доктар Р. К. Янкоўскі, міравы суддзя С. А. Вінаградаў, старшыня Невельскага партыйнага камітэта Я. П. Сянькоўскі, член Магілёўскай арганізацыі ўрач М. П. Яцуцін, доктар філасофіі Ж. Э. Кодзіс, грамадскі дзеяч С. Ф. Балкавец, кіраўнік кадэцкай арганізацыі ў Горках гісторык С. Г. Цітовіч і інш.

На Беларусі кадэты атрымалі надзейную падтрымку і ў вайсковым асяроддзі. Напрыклад, пры Мінскім губернскім аддзяленні партыі дзейнічала вайсковая фракцыя, якую ўзначальваў генерал-маёр А. А. Меснер. Такая ж фракцыя функцыянавала і пры Магілёўскім губернскім камітэце, у склад якой уваходзілі Б. М. Пятніцкі (вайсковы чыноўнік), М. Г. Міхееў (капітан), К. Істомін, В. Зыкаў і Л. Шыманоўскі (вайсковыя чыноўнікі). Прадстаўнікі афіцэрства аказвалі моцны ўплыў і на Віцебскую гарадскую арганізацыю кадэтаў. Яе ўзначальваў паручнік С. Вейс [16].

Працэс арганізацыйнага афармлення кадэцкіх арганізацый на Беларусі і Заходнім фронце закончыўся восенню 1917 г. Аб гэтым заявіў франтавы з'езд партыі Народнай свабоды, які праходзіў у Мінску 18—19 кастрычніка 1917 г. Акрамя дэлегатаў, якія прыбылі на з'езд ад армій фронта, на ім прысутнічалі прадстаўнікі кадэцкіх арганізацый з гарадоў і вёсак Беларусі. Дэлегатаў з'езда вітаў прадстаўнік вайсковай камісіі ЦК ПНС Б. Д. Плятнёў [17]. З'езд выказаў заклапочанасць нарастаннем рэвалюцыйнай барацьбы працоўных. Аднак, указаўшы на небяспеку недаацэнкі сістэматычнай работы партыі сярод шырокіх народных мас, дэлегаты з'езда не змаглі выпрацаваць канструктыўнай праграмы выхаду з крызісу.

Кадэты, хоць і пашырылі сацыяльную базу партыі за кошт прыцягнення ў яе шэрагі прадстаўнікоў дэмакратычных пластоў насельніцтва, па сваіх памкненнях і класавай палітыцы заставаліся арганізацыяй ліберальнай буржуазіі. Палітыка кадэтаў вынікала з анексіяніцкіх памкненняў расійскага капіталу.

Партыя Народнай свабоды паўтарала памылку царскага самаўладдзя, не спяшаючыся з рашэннем найбольш вострых сацыяльных пытанняў, пастаўленых рэвалюцыяй. Такую ж палітычную лінію кадэты праводзілі і на Беларусі. Партыя не здолела дабіцца шырокай падтрымкі дэмакратычных слаёў насельніцтва, перш за ўсё рабочых і беднейшага сялянства. Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі дзейнасць кадэцкіх арганізацый была забаронена. Паражэнне кадэцкай партыі было прадвызначана радыкалізмам народных мас, якія не прынялі дэмакратычную праграму кадэтаў па перабудове грамадства. Гэта выкарысталі ў сваіх інтарэсах бальшавікі, якія ўстаранілі кадэтаў з палітычнай арэны як найбольш небяспечнага канкурэнта ў барацьбе за ўладу.

[1] А с т р а х а н  Х. М. Большевики и их политические противники в 1917 г. Л., 1973. С. 184.

[2] ЦДАКР Расіі. Ф. 523, воп. 2, спр. 14, арк. 15.

[3] Ш е л о х а е в  В. В. Идеология и политическая организация российской либеральной буржуазии 1907—1914 гг. М., 1991. С. 10, 12.

[4] Гл.: Д у м о в а  Н. Г. // Наука и жизнь. 1990. № 10. С. 74; К у в ш и н о в  В. А. // Вопросы истории КПСС. 1991. № 8. С. 83.

[5] Пры падліку выкарыстаны матэрыял «Весніка партыі Народнай свабоды» (ВПНС) за 1917 г., а таксама падрыхтаваныя ЦК партыі кадэтаў «Примерные маршруты для командировок в провинцию» — ЦДАКР Расіі. Ф. 579, воп. 1, спр. 809а, арк. 1, 2.

[6] ВПНС. 1917. № 3. С. 17, 26—27; № 11—13. С. 36; № 17—18. С. 18; № 26—27. С. 17.

[7] Там жа. № 8—10. С. 26, 29; 23; 28; 31.

[8] Там жа. № 14—16. С. 35.

[9] ЦГА РБ. Ф. 35, воп. 1, спр. 71, арк. 11.

[10] ЦДАКР Расіі. Ф. 579, воп. 1, спр. 845, арк. 28.

[11] ВПНС. 1917. № 11—13. С. 36; № 17—18. С. 18.

[12] Там жа. № 11—13. С. 25—26.

[13] День. 1917. 15 верасня. С. 1.

[14] ВПНС. 1917. № 3. С. 18; № 6—7. С. 2.

[15] Минская жизнь. 1917. 24 кастрычніка. С. 2; ВПНС. 1917. № 17—18. С. 2; № 31. С. 21—22.

[16] Минская жизнь. 1917. 14 кастрычніка. С. 3; ВПНС. 1917. № 8—10. С. 26; № 26—27. С. 18.

[17] Минская жизнь. 1917. 25 кастрычніка. С. 3.